# Вучэбна-метадычнае забеспячэнне вучэбнага прадмета “Навучанне грамаце”: I клас устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання

Новае вучэбна-метадычнае забеспячэнне вучэбнага прадмета “Навучанне грамаце” для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання распрацавана ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай, якая зацверджана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь (2021 г.).

Новая вучэбная праграма па вучэбным прадмеце “Навучанне грамаце” надрукавана ў навукова-метадычным часопісе “Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа” (2021, № 4).

З асаблівасцямі новага вучэбна-метадычнага комплексу (ВМК) па навучанні грамаце знаёміць артыкул “Новы вучэбна-метадычны комплекс «Навучанне грамаце. 1 клас»: асноўныя і дадатковыя кампаненты” навукова-метадычнага часопіса “Пачатковая школа” (2021, № 8).

Распрацоўкі ўрокаў чытання і пісьма да новага ВМК друкуюцца ў часопісе “Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа” (2021, № 4–12).

У склад вучэбна-метадычнага забеспячэння, якое падрыхтавана да 2021/2022 навучальнага года аўтарамі В.І. Свірыдзенка і В.І. Цірынавай, уваходзяць: прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне, вучэбныя дапаможнікі для вучняў і вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў. Прадставім іх агульную характарыстыку.

<table>
<tr><th colspan="2">Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне</th></tr>
<tr><td>
</td>
<td>Цірынава, В.І. Пачатковая школа. 1 клас. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : 2021/2022 навучальны год / В.І. Цірынава і інш. – Мінск : Аверсэв, 2021.<br><br>Дапаможнік уключае планаванне вучэбнага матэрыялу па раздзелах “Навучанне чытанню” і “Навучанне пісьму” вучэбнай праграмы “Навучанне грамаце”. Для кожнага ўрока вызначаюцца адукацыйныя мэты, спосабы дзеянняў, абагульненні па ўроку, вучэбнае абсталяванне.<br><br>Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь</td></tr>
<tr><th colspan="2">Буквар</th></tr>
<tr><td>
</td>
<td>Свірыдзенка, В.І. Буквар : вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021.<br><br>Новы буквар падрыхтаваны ў рамках конкурсу на стварэнне вучэбных дапаможнікаў для I–IV класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.<br>Асаблівасці буквара:<br>новая графічная сістэма адлюстравання гукаў;<br>новы парадак увядзення літар;<br>выкарыстанне анімацыйных фільмаў (праз QR-код);</td></tr>
</table>



вучэбныя тэмы “Склад слова”, “Націск”, “Галосныя гукі”, “Звонкія і глухія зычныя гукі” перанесены з асноўнага перыяду навучання ў падрыхтоўчы;

увядзенне ў змест навучання сістэмы арыенціраў, апорных схем, алгарытмаў для засваення спосабаў дзеянняў;

новая сістэма практыкаванняў для фарміравання і адпрацоўкі навыку чытання складоў і слоў;

новы змест твораў для чытання і сістэма працы з імі, уключэнне заданняў для развіцця чытацкай граматнасці вучняў, умення працаваць з інфармацыяй;



увядзенне ў змест буквара заданняў, якія звязаны з пазакласным чытаннем;

новая сістэма заданняў для развіцця маўлення вучняў, якая накіравана на засваенне правіл і прынцыпаў зносін, спасціжэнне нацыянальных традыцый і каштоўнасцей беларусаў;

новая сістэма заданняў для фарміравання вучэбнай кампетэнцыі вучняў (арыентацыя ў вучэбнай кнізе; засваенне новых ведаў праз праблемныя сітуацыі і пытанні; заданні для арганізацыі калектыўнага ўзаемадзення вучняў у парах і групах; развіццё навыкаў самакантролю і самаацэнкі і інш.)



У буквар уведзены гульнявыя персанажы: Кірыліца, Жэўжык, сябры гукаў – добрыя чарадзеі Бім і Бом.






Кірыліца знаёміць вучняў з новымі літарамі, дае парады, тлумачыць незнаёмыя словы, просіць адказаць на пытанні па змесце прачытаных тэкстаў, арганізуе пошук інфармацыі з дадатковых крыніц.

Жэўжык вельмі хоча навучыцца добра чытаць і спадзяецца, што вучні будуць яму дапамагаць. Ён часта трапляе ў цяжкія сітуацыі (“пасткі”) і чакае дапамогі ад вучняў.

Чарадзеі Бім і Бом – сябры гукаў. Яны дапамагаюць вучням знаёміцца з цвёрдымі і мяккімі зычнымі гукамі, вучаць адрозніваць на слых гукі і правільна пазначаць іх літарамі, чытаць склады і словы.







У новым буквары зменены **парадак увядзення літар**. Пачынаецца асноўны перыяд вывучэннем зычных гукаў і адпаведных літар. Вучні знаёмяцца з літарамі ***С, Л, М***.

Пасля вывучэння трох літар зычных гукаў уводзіцца першы галосны гук [а] і літара ***А***. Гэта дае магчымасць пачаць навучанне чытанню прамых складоў “па падабенстве”: *са, ла, ма*.

Наступнымі ўводзяцца літары ***І, Ы, У***.

Увядзенне літар, якія абазначаюць галосныя гукі, дазваляе пачаць фарміраванне першапачатковага механізму чытання прамога склада (зычны + галосны), задаючы рух вачэй «ад зычнага да галоснага». З псіхафізіялагічнага пункту гледжання механізм расшыфроўкі літарнага кода, зададзенага ў складзе «зычны + галосны», гучыць так: «Глядзі, што за літарай зычнага гука».

У буквары выкарыстаны новыя прыёмы для навучання чытанню прамога склада, якія палягчаюць яго зрокавае ўспрыманне і першаснае чытанне: чытанне па дарожках з чарапахай і ракетай; чытанне склада з апорай на прадметны малюнак і інш. Вучні чытаюць склады спачатку ў павольным тэмпе з чарапахай, затым у хуткім тэмпе з ракетай.

Новы парадак увядзення літар дае магчымасць максімальна хутка пачынаць чытаць словы, сказы і невялікія тэксты. Прапануецца больш матэрыялу для адпрацоўкі навыку чытання тэкстаў.

Спецыяльныя слупкі слоў у рамках з ракетай, табліцы на форзацах буквара для трэніроўкі хуткага чытання складоў і слоў, тэксты з элементамі трэнажора – усё гэта забяспечыць якасны вынік навучання.

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь*

## Спадарожнік буквара




*Свірыдзенка, В.І. Спадарожнік буквара : дапаможнік для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021.*

У дапаможніку прадстаўлена сістэма заданняў для арганізацыі дыферэнцыраванай работы з вучнямі, якія ўмеюць чытаць. Вучэбны матэрыял непасрэдна звязаны з тэматыкай адпаведнай старонкі буквара. Змест вучэбнага выдання ўключае творы, розныя па аб’ёме і ступені складанасці, што дазваляе арганізаваць працу з вучнямі з улікам узроўню сфарміраваннасці ў іх навыку чытання (ад паскладовага чытання да чытання цэлымі словамі).

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

## Рабочы сшытак да буквара






*Свірыдзенка, В.І. Рабочы сшытак да “Буквара” : дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: Аверсэв, 2021.*

Рабочы сшытак да “Буквара” дазваляе арганізаваць практычную дзейнасць вучняў па замацаванні вучэбнага матэрыялу.

Змест заданняў сшытка прадугледжвае:

- практыванні ў пісьме друкаваных літар;
- гукавы аналіз слоў;
- працу са схемамі слоў і сказаў;
- моўныя гульні.

Вучэбны матэрыял дапаможніка звязаны са зместам і тэматыкай адпаведнай старонкі буквара.

Невялікі аб’ём заданняў дазваляе адвесці на іх выкананне ад 2 да 5 хвілін.

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

## Пазакласнае чытанне







*Свірыдзенка, В.І. Пазакласнае чытанне. 1 клас : дапаможнік для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: Аверсэв, 2021.*

Дапаможнік змяшчае ілюстраваныя творы для рэалізацыі метаду чытання-разгляду дзіцячых кніг.

Згодна з вучэбнай праграмай у дапаможніку прадстаўлены матэрыял 15 урокаў, на якіх будзе адбывацца знаёмства з творамі для пазакласнага чытання.

Пазакласнае чытанне праводзіцца адзін раз у два тыдні, займаючы другую частку ўрока чытання.

На занятках па пазакласным чытанні ў вучняў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання.

З мэтай выканання вучэбнай праграмы па раздзеле “Пазакласнае чытанне” ў буквар уключаны заданні, якія звязаны як з вучэбнай тэмай навучання грамаце, так і з тэмай пазакласнага чытання. Такія заданні вылучаны ў буквары ўмоўным знакам “Пазакласнае чытанне”.

Змест твораў дапаможніка “Пазакласнае чытанне. 1 клас” адпавядае тэматыцы вучэбных тэкстаў буквара.

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

## Прапісі




*Свірыдзенка, В.І. Пропісь 1 : вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021.*

*Свірыдзенка, В.І. Пропісь 2 : вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021.*

*Свірыдзенка, В.І. Пісьмо : вучэбны дапаможнік для 1 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021.*










Асаблівасці новых вучэбных дапаможнікаў:

- новая разліноўка прапісей;
- новае графічнае напісанне асобных літар;
- новая сістэма практыкаванняў для фарміравання графічнага навыку;
- новая сістэма заданняў для развіцця навыкаў самакантролю і самаацэнкі.

У разліноўку вучэбных дапаможнікаў «Пропісь 1», «Пропісь 2» уведзена дадатковая дапаможная (пункцірная) лінія, якая праходзіць уздоўж сярэдзіны міжрадковай прасторы. Мэта дапаможнай лініі – забяспечыць арыентаванне вучняў у вышыні вялікіх літар і элементаў малых літар, якія выходзяць за межы рабочага радка ўверх або ўніз.

Выявы літар адпавядаюць адзінаму ўзору, зацверджанаму для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.




Графічны аналіз літары прадугледжвае апору на элементы, размешчаныя ў пазлах. Першае самастойнае пісьмо новай літары ажыццяўляецца на радку з павялічаным узорам, які забяспечвае лепшае зрокавае ўспрыманне і эфектыўнае засваенне напрамкаў руху рукі.

<table>
<tr>
<td>





Правілы спісвання
1. Прачытай.
2. **Закрый узор.** Паўтары па памяці.
3. **Адкрый узор.** Прачытай, вымаўляючы словы па складах.
4. **Закрый узор.** Паўтары па памяці.
5. Дыктуй сам сабе па складах і запісвай.
6. Правер. Прачытай свой запіс па складах.
7. **Адкрый узор.** Правер па ўзоры.
Ці ёсць вялікая літара? Падкрэслі яе.
Правер знак прыпынку ў канцы сказа.
</td>
<td>
На асобным радку даецца ўзор напісання літары з вылучэннем колерам яе элементаў. Вучні прапісваюць кожны элемент літары па пункцірных лініях.<br><br>
Радкі прапісваюцца з прыпынкамі для адпачынку і самакантролю (умоўны знак «Сцяжок»). Настаўнік прапануе вучням выбраць самую прыгожую літару, падкрэсліць яе, абвесці або паставіць пад ёй кропку. Вучні працягваюць пісьмо, арыентуючыся на літару, якая атрымалася лепш за іншыя.<br><br>
Для самакантролю можна ўжыць кальку: літару, напісаную на кальцы прыёмам капіравання, сумяшчаюць з літарай у прописях з мэтай устанаўлення падабенства з узорам. Вынікі кантрольна-ацэначнай дзейнасці фіксуюцца на лінейцы самаацэнкі.<br><br>
У канцы вучэбных дапаможнікаў «Пропісь 1», «Пропісь 2», «Пісьмо» прадугледжаны старонкі (у тым ліку з частай нахільнай разліноўкай) для арганізацыі дыферэнцыраванай работы з вучнямі з мэтай адпрацоўкі навыку напісання літар, выканання дадатковых заданняў настаўніка, фарміравання ўмення чытаць склады і словы, запісаныя рукапісным шрыфтам.<br><br>
Прыведзены памяткі «Правілы спісвання» і «Правілы пісьма пад дыктоўку».<br><br>
Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь
</td>
</tr>
<tr>
<td colspan="2">Дапаможнік для вучняў (дадатковы кампанент)</td>
</tr>
<tr>
<td>



</td>
<td>
Свірыдзенка, В.І. Пропісі з анімацыяй. 1 клас : дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: Аверсэв, 2021.<br><br>
Дапаможнік “Пропісі з анімацыяй” прызначаны для адпрацоўкі вучнямі навыку пісьма і ўключае:
<ul>
<li>азбуку ў малюнках;</li>
<li>навучальныя відэаролікі;</li>
<li>узоры напісання элементаў літар, асобных літар, злучэнняў, слоў і сказаў;</li>
<li>элементы трэнажора;</li>
<li>заданні для самастойнага пісьма.</li>
</ul>
QR-коды адкрываюць відэаролікі з інтэрактыўнай дэманстрацыяй узораў напісання элементаў, літар і іх злучэнняў, якія поўнасцю адпавядаюць новым пропісям.<br><br>

</td>
</tr>
</table>

**Вучэбны наглядны дапаможнік**




*Тиринова, О.И. Демонстрационный набор письменных букв / О.И. Тиринова. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2015.*

Вучэбны наглядны дапаможнік для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання змяшчае выявы ўсіх літар рускага і беларускага алфавітаў і метадычны каментарый да іх напісання.

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

**Вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў**







*Свірыдзенка, В.І. Навучанне чытанню ў 1 класе, у 2 ч. : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021.*

*Свірыдзенка, В.І. Навучанне пісьму ў 1 класе : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: НІА, 2021.*

У вучэбна-метадычных дапаможніках прадстаўлена сістэма працы настаўніка ў падрыхтоўчы, асноўны і заключны перыяды навучання грамаце з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў “Буквар”, “Пропісь 1”, “Пропісь 2” і “Пісьмо”. Да кожнага этапу навучання прыводзіцца пералік запланаваных вынікаў навучання (прадметных, метапрадметных і асобасных), якія дапамогуць настаўніку сфармуляваць адукацыйныя, развіццёвыя і выхаваўчыя мэты вучэбных заняткаў. Звяртаецца ўвага на абагульненні ўрока (вывады) і спосабы дзеянняў, якімі вучні павінны авалодаць.

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

У 2021 годзе пачаў работу Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс, на якім размешчаны мультымедыйныя матэрыялы па вучэбным прадмеце “Навучанне грамаце”, распрацаваныя педагогамі ДУА “Гімназія з беларускай мовай навучання № 23 г. Мінска” да новага ВМК.

Выкарыстанне пералічаных асноўных і дадатковых кампанентаў ВМК дапаможа настаўніку забяспечыць паспяховае дасягненне першакласнікамі вынікаў навучання, акрэсленых у вучэбнай праграме “Навучанне грамаце”.

***Цірынава В.І.,*** *вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукыцыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*

***Свірыдзенка В.І.,*** *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*